# РАЗВІЦЦЁ ЮРЫДЫЧНАЙ НАВУКІ Ў ПРАЦАХ ГІСТОРЫКА ПРАВА, ДОКТАРА ЮРЫДЫЧНЫХ НАВУК, ПРАФЕСАРА Т. І. ДОЎНАР

**Л. Л. Голубева**
*дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, кандыдат юыдычных навук, дацэнт*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск, Беларусь*

У артыкуле паказаны значны ўклад гісторыка права, доктара юрыдычных навук, прафесара Т. І. Доўнар у развіцце гісторыка-прававой навукі Беларусі. Прааналізаваны некаторыя навуковыя работы Прафесара, паказаны ўклад Т. І. Доўнар у стварэнне т развіцце навуковай школы гісторыі дзяржавы і права Беларусі, а таксама яе высокая публікацыйная актыўнасць.

В статье показан значительный вклад историка права, доктора юридических наук, профессорав Т. И. Довнар в развитие историко-правовой науки Беларуси. Проанализированы некоторые научные работы Профессора, показан вклад Т. И. Довнар в создание и развитие научной школы истории государства и права Беларуси, а также ее высокая публикационная активность.

The article shows the significant contribution of the historian of law, Doctor of Law, Professor T. Dovnar to the development of the historical and legal science of Belarus. The contribution of T. Dovnar to the creation and development of a scientific school of the history of state and law of Belarus, as well as its high publication activity, is described.

Прафесар Доўнар Т. І. з’яўляецца вядомым вучоным у галіне гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Яна паспяхова займаецца навукова-даследчай працай, аб чым сведчаць больш за 400 навуковых публікацый, у тым ліку 8 манаграфій, 19 падручнікаў і навучальных дапаможнікаў. Яе навуковыя артыкулы па актуальных і праблемных пытаннях прававой гісторыі Беларусі друкаваліся ў журналах “Веснік БДУ”, “Юстыцыя Беларусі”, “Полымя”, “Судовы веснік”, “Беларускі гістарычны часопіс” і інш.

Усё жыццё Таісіі Іванаўны Доўнар звязана з юрыдычным факультэтам. Яшчэ будучы студэнткай 5 курса, у сакавіку 1973 г. Таісія Іванаўна стала працаваць на факультэце старшым лабарантам кафедры крыміналістыкі і паступова прайшла ўсе ступенькі – ад выкладчыка да прафесара (з 1988 г. – дацэнт, з 1998 г. – прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права). Займалася даследаваннем гісторыка-прававых пытанняў. Першыя публікацыі былі прысвечаны савецкаму перыяду гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Галоўнай тэмай даследавання стала гісторыя беларускага кастытуцыяналізму, па якой і была абаронена ў 1986 г. кандыдацкая дысертацыя ў Ленінградскім

дзяржаўным універсітэце на тэму “Пераемнасць у канстытуцыйным будаўніцтве Беларускай ССР”.

Шэраг з яе прац (манаграфія і некалькі вучэбных дапаможнікаў) прысвечаны савецкаму перыяду гісторыі дзяржавы і права Беларусі, дзе даследуецца працэс станоўлення і эвалюцыі беларускай дзяржаўнасці ў паслякастрычніцкі перыяд, характарызуецца паэтапны працэс развіцця права, надаецца ўвага гісторыі Канстытуцыі БССР, важнейшым галінам права, пытанням кадыфікаванага заканадаўства.Так, у кнізе “Краткий очерк истории государства и права Республики Беларусь” (Мінск, 1997) прааналізаваны важнейшыя падзеі працэса станаўлення беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці пасля 1917 г., ахарактарызаваны этапы яе развіцця, выяўлены пэўныя тэндэнцыі ў развіцці савецкага права. Выказаны і аргументаваны ўласны погляд на шматлікія праблемныя пытанні гэтага перыяду развіцця беларускай дзяржаўнасці.

Пазней у сферу навуковых інтарэсаў уваходзілі ў большасці мала даследаваныя пытанні дасавецкага перыяду айчыннай гісторыі, у тым ліку адносна эвалюцыі дзяржаўнасці Беларусі, гісторыі органаў улады і кіравання, судовых органаў, прававога становішча насельніцтва, крыніц права, развіцця інстытутаў і галін права. Вынікам даследаванняў стала абарона ў 1997 г. у БДУ доктарскай дысертацыі на тэму: “Развіццё агульназемскага права Беларусі ў XV – XVI стагоддзях”.

Яе навуковыя інтарэсы непасрэдна звязаны з гісторыяй дзяржавы і права Беларусі. У сваіх працах яна паказвае характэрныя рысы і асаблівасці развіцця дзяржаўнасці Беларусі на важнейшых гістарычных этапах, раскрывае тэндэнцыі ў развіцці права, падкрэслівае адметнасць і прагрэсіўныя набыткі прававой гісторыі і прававой культуры Беларусі, узаемасувязь гістарычнага развіцця айчыннай прававой сферы з агульнаеўрапейскім працэсам эвалюцыі права. Асобныя навуковыя працы прысвечаны гісторыі канстытуцыйнага, крымінальнага, грамадзянскага, працэсуальнага права Беларусі, гісторыі айчыннай палітычнай і прававой думкі і інш. Галоўнай жа мэтай навуковых даследаванняў з’яўлялася ліквідацыя прабелаў у гісторыка-прававой навуцы, якіх нажаль і зараз застаецца вельмі шмат.

Манаграфіі “Грамадзянскае права феадальнай Беларусі XV-XVI стст.” (Мінск, 1997) і “Развіццё асноўных інстытутаў грамадзянскага і крымінальнага права Беларусі ў ХУ – ХУ1 стагоддзях” (Мінск, 2000) прысвечаны праблемам станаўлення і развіцця важнейшых галін і інстытутаў права. Асноўная ўвага надаецца эвалюцыі такіх інстытутаў феадальнага грамадзянскага права Беларусі, як рэчавае, сервітутнае, залогавае, абавязацельнае, спадчыннае, а таксама праблеме злачынства і пакарання.

Аўтар аналізуе працэс фарміравання асобных інстытутаў феадальнага права і выкладае ўласную канцэпцыю фарміравання агульназемскага (агульнадзяржаўнага) грамадзянскага і крымінальнага права Беларусі ў XV – XVI стст. Спачатку даецца дастаткова поўны аналіз навуковай літаратуры адносна крыніц права. Аўтар выказвае свае погляды на галоўныя і дапаўняльныя крыніцы права ў т. зв. прывілейны і статутовы перыяды, вызначае ролю звычаёвага права, межы запазычання рымскага, кананічнага, нямецкага права.

Т. І. Доўнар упершыню ў беларускай гісторыка-прававой навуцы комплексна ахарактарызавала грамадзянскае права феадальнага перыяду, правільна адзначаючы, што толькі ў суадносінах і ўдакладненні межаў дзеяння публічнага і прыватнага права можна падзяліць яго па галіновай прыкмеце. Яна пераканаўча аргументавала, што пры кадыфікацыі заканадаўства ў ВКЛ у другой палове XVI ст. на падставе ўласнага вопыту і дасягненняў еўрапейскай прававой навукі была выпрацавана новая прававая сістэма, якая грунтавалася на зараджэнні галіновай структуры права.

У манаграфіях дадзены поўны і паслядоўны тэарэтыка-прававы аналіз рэчавага права. Пры гэтым аўтар выказвае ўласны погляд на месца, ролю і значэнне развіцця феадальнай уласнасці на зямлю, выяўляе пэўныя тэндэнцыі ў развіцці гэтага інстытута. Падставай для абагульненняў і вывадаў аўтара адносна рэчавага, залогавага і сервітутнага права з’явілася не толькі вывучэнне заканадаўства феадальнага перыяду, але і аналіз сацыяльна-эканамічнага становішча грамадства.

У гэтых працах упершыню ў гісторыка-прававой навуцы даследуецца эвалюцыя абавязацельнага права Беларусі, зроблены тэарэтыка-прававы аналіз такіх асноўных дагавораў як купля-продаж, мена, дарэнне, пазыка, паклажа, найм (маёмасны і асабісты).

Аўтар спыняецца таксама на пытаннях спадчыннага права. На падставе параўнальнага аналізу прававога матэрыялу характарызуе парадак і асаблівасці наследавання па закону і па завяшчанню. Агульны вывад адносна таго, што спадчыннае права было добра распрацаваным і забяспечвала маёмасныя правы дзяцей, жанчын і асоб, звязаных роднасцю, аргументаваны нормамі Статутаў 1529, 1566 і 1588 гг.

У шэрагу кніг Т. І. Доўнар разглядаюцца пытанні крымінальнага права феадальнага перыяду. Складанасць гэтай праблемы была не толькі ў тым, што яе асобныя аспекты даследаваліся вучонымі ў канцы XIX ст., але і ў тым, што аўтару прыйшлося супастаўляць пазіцыі дарэвалюцыйных і сучасных вучоных пры даследаванні тэарэтыка-прававых палажэнняў крымінальнага права. Былі прааналізаваны такія

асноўныя пытанні, як паняцце злачынства, яго склад, саўдзел, датычнасць да злачынства, абставіны, што выключаюць злачынны характар дзеянняў, паняцце пакарання, яго мэты і інш. Значная ўвага ў працах надавалася класіфікацыі відаў злачынстваў і відаў пакаранняў.

Несумненную навуковую цікавасць выклікаюць тыя палажэнні прац Т. І. Доўнар якія раскрываюць сутнасць і спецыфіку такіх прававых інстытутаў, як неабходная абарона, крайняя неабходнасць, саўдзел і датычнасць да злачынства. Аўтар прапануе сваё бачанне шэрагу праблем крымінальнага права, і гэта выклікае несумненны інтарэс сучасных навукоўцаў. Рэтраспектыўны агляд праблем крымінальнага права можа аказаць дапамогу сучаснаму заканадаўцу, хаця бы ў сувязі з тым, што аўтар спыняецца на недахопах мінулага крымінальнага заканадаўства.

Т. І. Доўнар пераканаўча паказвае параўнальна высокую для свайго часу развітасць крымінальнага закону Беларусі ХУ1 ст., актыўнае ўспрыманне ім усяго таго новага і прагрэсіўнага, што выпрацавала сусветная прававая навука. На падставе параўнальнага аналізу аўтар выяўляе асноўныя тэндэнцыі ў развіцці крымінальнага права: замяшчэнне сістэмы матэрыяльных кампенсацый новай сістэмай публічна-крымінальных пакаранняў, уключэнне ў закон такіх новых мэтаў пакарання, як выпраўленне і перавыхаванне злачынцаў, высоўванне на першы план грамадскіх інтарэсаў пры рэгламентацыі крымінальна-прававых адносін і інш. Аўтар робіць правільны агульны вывад адносна таго, што павелічэнне прагрэсіўнасці і развітасці крымінальнага закону на працягу XVI ст., набыццё ім такіх рыс, як гуманізм, вяршэнства закону, індывідуалізацыя адказнасці, прэзумпцыя невінаватасці, сведчыла аб параўнальна высокім узроўні крымінальнага права Беларусі феадальнага перыяду.

Вызывае асаблівую цікавасць кніга праф. Т. І. Доўнар “Канстытуцыйнае права Беларусі феадальнага перыяду (па Статутах Вялікага княства Літоўскага 1529, 1566, 1588 гг.), выдадзеная ў 2001 г. Невялікая па памеру кніжка (84 с.) з’яўляецца вельмі важнай як для ўсей гісторыі Беларусі, так і для гісторыка-прававой навукі.

Упершыню ў навуковай літаратуры на падставе даследавання нарматыўнага прававога матэрыялу, раскрываецца працэс складвання і развіцця нормаў і інстытутаў самай важнай галіны права – канстытуцыйнага права. Аналізуючы нормы канстытуцыйнага характару статутаў 1529, 1566, 1588 гг. у іх паслядоўным развіцці і параўноўваючы іх з папярэднім заканадаўствам, аўтар паказвае, як зараджаліся асновы беларускага канстытуцыяналізму, падкрэслівае прагрэсіўную накіраванасць канстытуцыйнага закону. Кніга дае магчымаць уявіць і

асэнсаваць высокі ўзровень прававой культуры беларускага народа, што з'яўляецца вельмі важным у сучасны перыяд нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва.

Такім чынам, Т. І. Доўнар у сваіх шматлікіх публікацыях на падставе комплекснага аналізу прававых крыніц і абагульнення навуковай літаратуры не толькі выявіла фактары, якія абумовілі спецыфіку і тэндэнцыі ў развіцці асобных інстытутаў феадальнага права на стадыі яго фарміравання як агульназемскага і ахарактарызавала пэўныя галіны і інстытуты феадальнага права, але і паказала ўзаемасувязь права Беларусі з агульнаеўрапейскім працэсам эвалюцыі права.

Вывады аўтара грунтуюцца не толькі на вывучэнні і абагульненні шматлікіх літаратурных крыніцах (дарэчы і на працах першага рэктара БДУ У. І. Пічэты), але і на выкарыстанні і сістэмным аналізе заканадаўства, а таксама на аналізе шматлікага актавага матэрыялу, змешчанага ў Літоўскай Метрыцы, Актах Віленскай Археаграфічнай камісіі, Актах Заходняй Расіі і іншых зборніках дакументальна-прававога матэрыялу.

Публікацыі праф. Доўнар Т. І. уносяць значны ўклад у асэнсаванне гістарычнай значнасці нацыянальнагага жыцця беларускага народа. Яны ўводзяць у навуковы абарот палажэнні, якія ліквідуюць прабелы ў гісторыка-прававой навуцы. Неабходна адзначыць, што працы прафесара Доўнар Т.І. (не толькі вучэбныя дапаможнікі, але і манаграфіі) выкарыстоўваюцца ў вучэбным працэсе ўсіх вышэйшых юрыдычных навучальных устаноў Беларусі.

Вынікам шматгадовай плённай працы прафесара Т. І. Доўнар з'вілася выданне ў 2014 г. першага ў гісторыі Беларусі падручніка па гісторыі дзяржавы і права Беларусі. У падручніку гістарычна паслядоўна выкладаюцца асноўныя пытанні, якія тычацца развіцця дзяржаўнасці Беларусі на важнейшых этапах гістарычнага развіцця, пачынаючы з далёкай старажытнасці (узнікненне Полацкага і інш. дзяржаў-княстваў) да сучаснага часу. Пры выдзяленні і характарыстыцы перыядаў развіцця беларускай гісторыі, аўтар надае ўвагу ўнутраным і знешнім прычынам, уздзейнічаючым на развіццё беларускай дзяржаўнасці. У рабоце падкрэсліваецца, што характэрныя рысы сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага жыцця беларускага народа знайшлі найбольш яркае адлюстраванне ў гісторыі права. У сувязі з гэтым на аснове крытычнага пераасэнсавання літаратурных крыніц і аналіза гістарычнага дакументальна-прававога матэрыялу ў кнізе атрымалі адлюстраванне ўласны погляд аўтара на гістарычныя з'явы і працэсы дакастрычніцкага перыяду, на асаблівасці станаўлення і развіцця БССР, а таксама на

характэрныя асаблівасці і тэндэнцыі ў развіцці дзяржавы і права Рэспублікі Беларусь у канцы XX – пачатку XXI ст.

Аўтарская пазіцыя ў дадзеным падручніку праяўляецца ў тым, што на аснове папярэдніх навуковых напрацовак (прац вучоных дарэвалюцыйнага, савецкага перыядаў, а таксама сучасных публікацый) Т. І. Доўнар паказвае сваё бачанне тых або іншых гісторыка-прававых пытанняў і праблем і знаходзіць шляхі і сродкі доказаў уласных пазіцый. Палажэнні і вывады работы засноўваюцца на глыбокіх ведах вялікага гістарычнага масіву дакументальна-прававога матэрыялу (у тым ліку на вывучэнні папярэдняй судовай і адміністратыўнай практыкі), на пераасэнсаванні пазіцый папярэдніх навукоўцаў, выказаных у навуковай літаратуры савецкага і дасавецкага перыядаў. Пры гэтым аўтар з павагай адносіцца да прац папярэдніх навукоўцаў. Многія палажэнні падручніка падмацаваны спасылкамі на іх, і асабліва гэта тычыцца работ знакамітага вучонага ў сферы гісторыка-прававой навукі Беларусі доктара юрыдычных навук, прафесара І. А. Юхо.

Прадстаўляюцца вельмі важнымі ў падручніку палажэнні, характарызуючыя важнейшыя этапы і самыя галоўныя падзеі гісторыі беларускай дзяржаўнасці, а таксама вывады аўтара, у тым ліку адносна старажытнасці паходжання беларускай дзяржаўнасці, гістарычнай важнасці дасягненняў беларускай прававой думкі XVI ст. (што асабліва праявілася пры кадыфікацыі заканадаўства і падрыхтоўцы такіх знакамітых зводаў законаў, якімі з’яўляліся статуты ВКЛ 1529, 1566, 1588 гг.) і яе ўплыў на наступнае прававое развіццё.

У рабоце заканамерна нададзена ўвага перыяду Рэчы Паспалітай і перыяду знаходжання беларускіх зямель у складзе Расійскай Імперыі, прычым аўтар адзначае станоўчыя і адмоўныя моманты і тэндэнцыі ў дзяржаўна-прававым развіцці гэтых этапаў беларускай гісторыі. Значная ўвага нададзена ў рабоце пачатку XX ст. – перыяду ўзнаўлення беларускай дзяржаўнасці і тым праблемным пытанням, якія ўзнікалі ў гэты адносна кароткі, але надзвычайна важны і насычаны гістарычны час, значна паўплываўшы на ўсё нступнае развіццё дзяржавы і права. Надаецца таксама ўвага развіццю важнейшых дзяржаўных інстытутаў і галін права Беларускай ССР у 20-30-я гг. мінулага стагоддзя, у перыяд другой сусветнай вайны і пасляваенны перыяд. Раскрываючы характэрныя рысы і асаблівасці савецкага перыяду айчыннай гісторыі, аўтар адзначае як негатыўныя моманты і тэндэнцыі, так і прагрэсіўныя дасягненні ў развіцці савецкай дзяржаўнасці.

Апошнія главы падручніка прысвечаны гісторыі станаўлення суверэннай Рэспублікі Беларусь, развіццю права Рэспублікі Беларусь у канцы XX ст.

У кнізе, адпаведна ўсім гістарычным этапам, даецца характарыстыка дзяржаўнага і грамадскага ладу, прававога становішча насельніцтва, важнейшых крыніц права, галін права, судовай сістэмы.

Самастойнасць пазіцый аўтара перш за ўсё праяўляецца ў тым, што на аснове папярэдніх навуковых напрацовак (перш за ўсё прац дарэвалюцыйных навукоўцаў) Т. І. Доўнар стварае сваё бачанне тых або іншых гісторыка-прававых пытанняў і праблем і знаходзіць шляхі і сродкі доказаў уласных пазіцый. Палажэнні і вывады работы засноўваюцца на глыбокіх ведах вялікага гістарычнага масіву дакументальна-прававога матэрыялу (у тым ліку на вывучэнні папярэдняй судовай і адміністратыўнай практыкі), на пераасэнсаванні пазіцый папярэдніх навукоўцаў, выказаных у навуковай літаратуры савецкага і дасавецкага перыядаў.

Прадстаўляюцца вельмі важнымі ў падручніку палажэнні, характарызуючыя самыя галоўныя падзеі і этапы гісторыі беларускай дбзяржаўнасці і вывады аўтара адносна старажытнасці паходжання беларускай дзяржаўнасці, гістарычнай важнасці дасягненняў беларускай прававой думкі XVI ст. (што асабліва праявілася пры кадыфікацыі заканадаўства і падрыхтоўцы такіх значных зводаў законаў, якімі з’явіліся статуты ВКЛ 1529, 1566, 1588 гг.) і яе ўплыву на наступнае прававое развіццё, аб паслядоўным развіцці і прагрэсіўных тэндэнцыях у праве Беларусі.

На падставе даследаванняў гісторыі айчыннай прававой сферы, былі апублікаваны навуковыя працы аб развіцці асобных галін права (канстытуцыйнага, крымінальнага і грамадзянскага права і інш.), гісторыі беларускага парламентарызму і прававой культуры грамадств і інш. Так, былі апублікаваны манаграфіі «Грамадзянскае права феадальнай Беларусі XV-XVI стст.» (Мінск, 1997), “Уголовное право феодальной Беларуси (XIV-XVI вв)” (Мінск, 1995), «Развіццё асноўных інстытутаў грамадзянскага і крымінальнага права Беларусі ў XV-XVI стст.» (Мінск, 2000). Вынікам даследавання гісторыі айчыннага канстытуцыяналізму стала манаграфія ‘Гісторыя канстытуцыйнага права Беларусі”, выдадзеная ў 2001 г. у сааўт. з Р. А.Васілевічам і І. А.Юхо, а таксама вучэбны дапаможнік “Гісторыя канстытуцыйнага права Беларусі феадальнага перыяду (па Статутах 1529, 1566. 1588 гг.)” (Мінск, 2000). Таісія Іванаўна прымала ўдзел у шматлікіх калектыўных працах па сучасных прававых праблемах, у выданні вучэбных дапаможнікаў і падручнікаў. Напрыклад, Т. І. Доўнар стала сааўтарам падручнікаў па сучаснаму крымінальнаму праву (1997, 2002, 2015).

Асобным накірункам навукова-педагагічнай дзейнасці Прафесара стаў удзел у актуалізацыі важнейшых пытанняў айчыннай гісторыі і

передрукаванні помнікаў айчыннага права: Статута 1588 г. (1989 г.), Статута 1566 (2003 г.), іншых гістарычных помнікаў айчыннага права і палітыка-прававой думкі "Дагаворы і граматы як крыніцы беларускага феадальнага права" (ў сааўт., Мінск, 2000), "Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі XVI-XVIII стст" ў сааўт., Мінск, 2004). Таксама адным з накірункаў дзейнасці з'явіўся ўдзел у падрыхтоўцы энцыклапедычных выданняў, у тым ліку была адным з ініцыятараў выдання першага на беларускай мове "Юрыдычнага энцыклапедычнага слоўніка" (Мінск, 1989), адным з аўтараў і перакладчыкаў энцыклапедычнага выдання "Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Давед. Камент." (Мінск., 1989), а таксама ўдзельнічала ў падрыхтоўцы выданняў «Мысліцелі і асветнікі Беларусі: Энцыклапедычны даведнік» (Мінск,1995), "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі у 6 т." (1993-2003), "Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя у 2 т." (2005-2006), "Белорусской юридической энциклопедии в 4 т." (Т.1-2, 2008-2009) і інш.

У кантэксце кіраўніцтва навуковай школай гісторыі дзяржавы і права Беларусі, якую заснаваў прафесар І. А. Юхо, Таісія Іванаўна падрыхтавала аднаго доктара юрыдычных навук, дзевяць кандыдатаў навук. Прафесар Т. І. Доўнар ажыццяўляе каардынацыю навуковых даследаванняў у сферы гісторыка-прававой навукі, кіруе аспірантамі і саіскальнікамі. Бібліяграфія яе прац уключае звыш 400 публікацый, у тым ліку 8 манаграфій, падручнік, два курсы лекцый і звыш 15 вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў. Так, у апошнія гады былі апублікаваны: падручнік "Гісторыя дзяржавы і права Беларусі" (2014) з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, манаграфія "Права Беларусі ў кантэксце гістарычнай эвалюцыі дзяржаўнасці" [Электронны рэсурс: ISBN 978-985-566-576-6] (2018), калектыўная манаграфія "Курс уголовного права в 5 т. Общая часть. Т.1 : Учение о преступлении" (2018) і інш.

У межах навуковай школы ажыццяўляецца не толькі падрыхтоўка навуковых кадраў, але выпрацоўваюцца накірункі дальнейшых навуковых даследаванняў шляхам цеснага ўзаемадзеяння і абмена вопытам з навукоўцамі ВНУ Рэспублікі Беларусь і замежнымі вучонымі. Аб гэтым сведчаць сумесныя публікацыі навукоўцаў і падрыхтаваныя разам з Нацыянальным цэнтрам прававых даследаванняў, Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэтам, Беларускім інстытутам правазнаўства, Акадэміяй МУС Рэспублікі Беларусь, Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам і інш. шматлікія навуковыя і навукова-практычныя канферэнцыі. Так, у 2011 г. была праведзена міжнародная навуковая канферэнцыя, прысвечаная памяці

заснавальніка нацыянальнай гісторыка-прававой навуковай школы доктара юрыдычных навук прафесара І. А. Юхо. Былі выдадзены матэрыялы канферэнцыі і кніга "Памяць і слава", у якую ўвайшлі: адна з манаграфій навукоўцы, бібліяграфія яго публікацый, звесткі аб навуковай школе, успаміны яго калег і вучняў.

Удзельнікамі навуковай школы былі апублікаваны шматлікія навуковыя артыкулы, вучэбныя дапаможнікі і манаграфіі. Так, значнай навуковай падзеяй у 2001 г. стала выданне кнігі "Гісторыя канстытуцыйнага права Беларусі (Р. А. Васілевіч, Т. І. Доўнар, І. А. Юхо). У 2002 г. была апублікавана манаграфія Л. Л. Голубевай "Наследственное право феодальной Беларуси: по законодательству Великого княжества Литовского"; у 2007 г. - Ю. П. Доўнар "Судовая рэформа XVI ст. у Вялікім Княстве Літоўскім"; у 2013 г. - А. І. Адамюка "Становление и развитие военной юстиции в Беларуси" і інш. Навукоўцы прыкладвалі намаганні і ў перавыданні помнікаў права Беларусі (напрыклад, у 2003 г. быў перавыдадзены Статут 1566 г.), прымалі актыўны ўдзел у падрыхтоўцы энцыклапедычных выданняў ("Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г." (1989), "Энцыклапедыя гісторыі Беларусі ў 6 т." (1993-2003), "Мысліцелі і асветнікі Беларусі (1995), "Асветнікі зямлі Беларускай" (2001), "Вялікае Княства Літоўскае" (2005, 2005) "Беларуская юрыдычная энцыклапедыя ў 4 т. (2007-2013) і інш.

Важным накірункам навукова-даследчай работы гісторыкаў права з'яўляецца удзел у дзяржаўных праграмах навуковых даследаванняў, у распрацоўцы, навуковай экспертызе і навуковым каменціраванні праектаў нарматыўных прававых актаў і інш. Так, на працягу 2006-2010 гг. у кантэксце дзяржаўнай праграмы "Эканоміка і грамадства" пад кіраўніцтвам праф. Т. І. Доўнар распрацоўвалася тэма "Гісторыя ўзнікнення і развіцця дзяржаўнасці і нацыянальнай прававой сістэмы Беларусі". Былі вынесены прапановы па сістэматызацыі заканадаўства, пытаннях праватворчасці, ўдасканаленні заканадаўства. Шэраг палажэнняў і вывадаў былі прадстаўлены ў праватворчыя органы Рэспублікі Беларусь, укаранены ў вучэбны працэс.

Навуковыя працы праф. Т. І. Доўнар будуць садзейнічаць не толькі станаўленню навуковага светапогляду студэнтаў і прафесіяналізму ў прававой сферы, але фарміраванню іх грамадзянскай пазіцыі і патрыятызму.